# 108-я ГАДАВІНА З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ У. І. ЛЕНІНА

*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 14 (1201) ● 20 красавіка 1978 г. Цана 2 кап.

**Ленин**
**и теперь**
**живее всех живых.**
**Наше**
**знанье,**
**сила**
**и оружие**

**Юнакі і дзяўчаты! Настойліва авалодвайце ведамі, выхоўвайце ў сабе высокую ідэйнасць! Вучыцеся жыць, працаваць і змагацца па-ленінску, па-камуністычнаму!**

**Няхай жыве Ленінскі камсамол — надзейны памочнік і баявы рэзерв Камуністычнай партыі, перадавы атрад маладых будаўнікоў камунізму!**

*(З Заклікаў ЦК КПСС да 1 Мая 1978 года).*



## Адзначаючы Ленінскія дні

XXXV студэнцкая навуковая канферэнцыя, якая ў гэтыя дні праходзіць ва універсітэце, прысвячаецца 108-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. На большасці факультэтаў работа канферэнцыі пачыналася на пленарным пасяджэнні, а потым працягвалася па секцыях. Найбольш вялікай і разнастайнай была праграма канферэнцыі на гістфаку. Тут працавалі 18 секцый і 24 падсекцыі.

На пленарнае пасяджэнне былі вынесены наступныя даклады: «У. І. Ленін аб камуністычных адносінах да працы», з якім выступіў студэнт II курса аддзялення гісторыі А. Рубанаў (навуковы кіраўнік в. а. дацэнта П. І. Бондар); «З гісторыі камсамольскай арганізацыі БДУ імя У. І. Леніна — студэнтка IV курса аддзялення гісторыі Л. Крыўцова (навуковы кіраўнік в. а. дацэнта А. А. Тозік); «Студэнты БДУ імя У. І. Леніна ў Вялікай Айчыннай вайне» — студэнтка IV курса аддзялення гісторыі А. Жураўская (навуковы кіраўнік дацэнт І. В. Марчанка).

Вялікую ўвагу ў сваіх навуковых работах студэнты юрыдычнага факультэта ўдзялілі вывучэнню новай Канстытуцыі СССР. З дакладамі «Свабода асобы па новай Савецкай Канстытуцыі» (навуковы кіраўнік прафесар С. Т. Драбязка) выступіў чацвёртакурснік Н. Васько. Былі разгледжаны такія тэмы: «Новая Канстытуцыя СССР і формы камуністычнай маралі», «Юрыдычная адказнасць па новай Савецкай Канстытуцыі», «Культурна-выхаваўчая функцыя Савецкай дзяржавы ў святле новай Канстытуцыі СССР» і інш.

10 навуковых секцый працавала ў ходзе канферэнцыі на факультэце радыёфізікі і электронікі, механіка-матэматычным і хімічным факультэтах; у геаграфаў працавала 6 секцый, у студэнтаў журфака — 4. На ўсіх факультэтах вялікая ўвага аддавалася ўдзелу студэнтаў у рабоце секцый па грамадскіх навуках. Акрамя таго, на многіх факультэтах працавалі секцыі па англійскай мове.

Т. САХАШЧЫК.

Слова камсамольскаму сакратару

## ДЗЕНЬ СЁННЯШНІ

Нядаўна закончыў сваю работу XXVI з'езд ЛКСМБ, на якім у шэрагу іншых разглядалася і пытанне падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, комплекснага падыходу да камсамольскай работы, які забяспечвае адзінства ідэйна-палітычнага, працоўнага і маральна-эстэтычнага выхавання з улікам асаблівасцей розных катэгорый моладзі.

Якая ж работа вядзецца ў гэтым плане у нашай камсамольскай арганізацыі? У лютым у нас прайшла атэстацыя па грамадска-палітычнай практыцы. Найлепшых вынікаў у ёй дасягнуў II курс, на апошнім месцы трэцякурснікі. Неабходна адзначыць, што не заўсёды адзнакі выстаўляліся аб'ектыўна, асабліва на II курсе. І нам яшчэ трэба ўдасканальваць атэстацыю з тым, каб ГПП давала неабходныя вынікі, адпаведным чынам уздзейнічала на камсамольцаў.

Зразумела, чаму такое вялікае значэнне надаецца грамадскай дзейнасці студэнтаў. Сучасны малады спецыяліст павінен мець не толькі трывалыя веды па сваёй спецыяльнасці, але і вопыт грамадскай работы, быць добрым арганізатарам і выхавацелем у калектыве, дзе яму прадстаіць працаваць.

У гэтай сувязі неабходна сказаць пра актыўнасць камсамольцаў-супрацоўнікаў. Многія з іх па-ранейшаму мала ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці факультэта, не выконваюць камсамольскія даручэнні, не з'яўляюцца на сходы. У гэтым ёсць і наш недагляд. Камітэту камсамола неабходна больш актыўна ўцягваць у грамадскую работу камсамольцаў-супрацоўнікаў, больш строга кантраляваць выкананне даручэнняў.

Добра працуе на факультэце штаб працоўных спраў, шмат студэнтаў удзельнічаюць у будаўнічых атрадах. Сектар ваенна-патрыятычнага выхавання хімфака—адзін з лепшых ва універсітэце. Палепшыў сваю работу сектар інтэрнацыянальнага выхавання, створан клуб інтэрнацыянальнай дружбы, у якім удзельнічаюць камсамольцы ўсіх курсаў.

Наша шэфская група стала базай для набыцця навыкаў арганізатарскай работы. Добра працуе група «Доўг». Асабліва неабходна адзначыць работу аргкамітэта дня хіміка.

Але самай неабходнай нашай работай з'яўляецца паспяховая вучоба. Камітэтам камсамола напярэдадні зімовай сесіі былі праведзены індывідуальныя субяседаванні з першакурснікамі. За слаба паспяваючымі студэнтамі былі замацаваны выдатнікі. Дарэчы адзначыць, што на II курсе, дзе самая нізкая грамадская актыўнасць—і самая нізкая паспяховасць. Папрок за гэта мы можам зрабіць вучэбна-выхаваўчай камісіі факультэта, якая да сесіі працавала вяла: акадэмбюлетэні выпускаліся нерэгулярна і недастаткова асвятлялі пытанні вучобы. «Камсамольскі пражэктар» не аказаў дастатковай дапамогі вучэбна-выхаваўчай камісіі.

Усё гэта скіроўвае нас да таго, каб больш актыўна працаваць у групах, рабіць упор іменна на гэты напрамак работы. Неабходна ўзмацніць кантроль за наведваемасцю і бягучай паспяховасцю студэнтаў, ахапіць камсамольскімі даручэннямі як мага больш студэнтаў. Наша камсамольская арганізацыя павінна скіраваць усе свае сілы на паспяховае здзяйсненне задач, пастаўленых перад моладдзю XXV з'ездам КПСС.

А. РУХЛЯ,
сакратар камітэта камсамола хімфака.

## АБ'ЯВА

**25 красавіка 1978 года адбудзецца навукова-практычная канферэнцыя «Актуальныя праблемы дзейнасці камсамола ВНУ па ідэйна-маральнаму і эстэтычнаму выхаванню студэнцтва», прысвечаная 60-годдзю Ленінскага камсамола.**

**Пачатак работы канферэнцыі 25 красавіка ў 12.00, ауд. 206, гал. корпус.**

**АРГКАМІТЭТ.**

## ЧЫТАЦЬ ЛЕНІНА НЕАБХОДНА

У анкетах на пытанне аб прафесіі Уладзімір Ільіч пісаў: літаратар. Ён скончыў юрыдычны факультэт і працаваў у самарскай адвакатуры. Ён выступаў абаронцай на судзе. Ён выкладаў з гімназічнай лаўкі, даючы ўрокі; чытаў лекцыі ў школах для рабочых у Францыі і Італіі. Ён быў цудоўным прамоўцай, і прамовы яго маглі б стаць класічным узорам мастацтва прамоўцы. А ў анкетах, нягледзячы на ўсё гэта, яго цвёрдым, тонкім почыркам напісана: літаратар. Ці можа гэта быць выпадковасцю? Вялізная літаратурная спадчына Леніна — артыкулы, заметкі, даклады, даследаванні, кнігі, урыўкі з дзённікаў, запісы, якія замяняюць вуснае слова, пісьмы, рэцэнзіі, рэзалюцыі, рэплікі — пералічваць можна без канца, таму што ўся справа жыцця Леніна адлюстравана тут чорным па беламу, на тысячах старонак.

Чытаючы іх з дня ў дзень, бачыш Леніна жывым, рухаючымся, жэстыкулюючым, гнеўным, іранічным, радасным, клапатлівым, добрым — жэст і рух, пачуццё і настрой сказваюцца ў асаблівым прымяненні Леніным знакаў прапынку — косак, клічнікаў, пытальнікаў, двукоссяў, дужак, працяжнікаў, двухкроп'яў, у падкрэсліваннях — колькі розных падкрэсліванняў! Разбіўка, курсівы, натабены на палях, двайныя, трайныя лініі, якія вырастаюць адзін пад другім як патрабаванне асаблівай увагі... Друкарням туга даводзіцца ад гэтай пісьмовай ленінскай жэстыкуляцыі! Звычайнае «літаратурнае чытанне» Леніна нікому, магчыма, і ў галаву не прыходзіла. А між тым чытаць яго — неабходна. Перачытваючы яго з году ў год, вы знаходзіце ўсё новае і новае, быццам не старэеце вы з гадамі, а толькі становіцеся дарослымі, толькі вучыцеся разумець яго, цешыцца ім, рабіць для сябе маральныя, філасофскія, жыццёвыя адкрыцці.

М. ШАГІНЯН.

(З артыкула «За чытаннем Леніна»).

У дапамогу партгрупоргу

# Рэкамендацыі

## ПАРТГРУПОРГАМ ПА ПРАВЯДЗЕННЮ СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫХ СХОДАЎ

Справаздачна-выбарныя сходы ў партыйнай групе праводзяцца рэгулярна адзін раз у год. На гэтых сходах абмяркоўваюцца пытанні ўнутрыпартыйнага жыцця, таму такія сходы праводзяцца закрытымі. Аб тым, што адбудзецца сход, камуністам паведамляецца папярэдне. Кожны камуніст павінен прыняць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні справаздачна-выбарнага сходу, выказаць свае меркаванні.

Удзельнікі сходу даручаюць весці яго аднаму з камуністаў. У партыйных групах, дзе многа членаў КПСС, можна выбіраць і прэзідыум.

Даклад (справаздача) групорга на гэтым сходзе абавязковы. Пасля азнаямлення са справаздачай праводзіцца яе абмеркаванне. Размова ідзе дзелавая, прынцыповая. Няма патрэбы ў вялікіх прамовах, а вось крытычная ацэнка таго, што зроблена, канкрэтныя заўвагі, дзелавыя парады, рэкамендацыі і пажаданні на будучае неабходны. Сутнасць выказванняў, усе прапановы, ацэнка работы адлюстроўваюцца ў пратаколе.

Калі спрэчкі спынены і сход даў ацэнку дзейнасці важака групы, праводзяцца выбары партгрупорга, а ў буйнейшых групах — і яго намесніка.

У адпаведнасці з заўвагай да пункта 15 зацверджанай ЦК КПСС «Інструкцыі аб правядзенні выбараў кіруючых партыйных органаў» выбары партгрупоргаў могуць праводзіцца адкрытым галасаваннем, калі камуністы не будуць настойваць на правядзенні выбараў закрытым (тайным) галасаваннем. Калі вырашана праводзіць закрытае галасаванне, то ў буйных партгрупах выбіраецца падліковая камісія. Там жа, дзе менш дзесяці членаў партыі, падлік галасоў даручаюць старшынствуючаму або аднаму з членаў КПСС. Калі пры закрытым галасаванні, акрамя партгрупорга, выбіраецца яшчэ і намеснік, то выбары праводзяцца па двух спісах. Вынікі галасавання заносяцца ў пратакол.

Прыкладныя пытанні, якія неабходна ўсебакова абмеркаваць на справаздачна-выбарных сходах партыйных груп:

— Аналіз пытанняў унутрыпартыйнага жыцця, выкананне камуністамі патрабаванняў Статута КПСС.

— Аналіз партыйных сходаў партгрупы (пытанні, якія абмяркоўвала партгрупа непасрэдна, іх актуальнасць, актыўнасць камуністаў на сходах, падрыхтоўка і правядзенне такіх сходаў).

— Роля партгрупы ў павышэнні ідэйна - тэарэтычнага ўзроўню камуністаў і супрацоўнікаў калектыву.

— Удзел партгрупы ў арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, барацьба за ўмацаванне вучэбнай і працоўнай дысцыпліны.

— Удзел партгрупы ў падборы і выхаванні кадраў.

— Клопаты партгрупы аб павышэнні кваліфікацыі супрацоўнікаў.

— Удзел камуністаў групы ў ідэйна-выхаваўчай рабоце (формы ўдзелу, якасць, эфектыўнасць, абмеркаванне гэтых пытанняў на сходах партгруп).

— Як арганізуе партыйная група ідэйна-выхаваўчую работу са студэнтамі.

— Арганізацыя выканання партгрупай «Комплекснага плана ідэйна-палітычнага выхавання студэнтаў на ўвесь перыяд навучання».

— Ахоп партыйнымі даручэннямі, дапамога партгрупы ў іх выкананні, ажыццяўленне кантролю.

— Аналіз справаздач камуністаў на сходах партыйных груп аб выкананні імі свайго партыйнага і службовага абавязку.

— Арганізацыя работы партгрупорга, стыль і метады.

— Роля партгрупы ва ўмацаванні здаровага маральна-псіхалагічнага мікраклімату ў калектыве.

— Выкарыстанне крытыкі і самакрытыкі ў практычнай дзейнасці партгруп. Ажыццяўленне крытычных заўваг і прапаноў, якія выказваюцца на партыйных сходах.

— Клопаты партгрупы аб выхаванні маладых камуністаў (кантроль за выкананнем асабістых індывідуальных планаў праходжання кандыдацкага стажу, колькі разоў заслухоўвалі кандыдатаў у члены КПСС на партыйных сходах групы, якія рашэнні прымаліся, удзел маладых камуністаў у грамадскай рабоце ў сваіх калектывах і г. д.).

— Каардынацыя дзейнасці камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый калектыву і іншыя пытанні.

Безумоўна, у такім матэрыяле немагчыма прадугледзець усе пытанні, якія павінны стаць прадметам абмеркавання на справаздачна - выбарных сходах. Тут даюцца толькі прыкладныя рэкамендацыі. Кожная партгрупа адпаведна з тымі ўмовамі, у якіх яна працуе, можа расшырыць кола пытанняў, якія неабходна абмеркаваць на партыйным сходзе, дзе падводзяцца вынікі работы партгрупы за мінулы год. У полі зроку камуністаў партыйнай групы павінны знаходзіцца ўсе жыццёва важныя пытанні, якія датычаць гэтага калектыву.

Справаздачна-выбарны сход —важная веха ў жыцці партыйнай групы. Неабходна, каб ён прайшоў на высокім арганізацыйным і ідэйным узроўні ў адпаведнасці з патрабаваннямі рашэнняў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ.



Упэўнена крочыць другі семестр. Яго гарачы подых адчуваецца і ў ціхіх утульных лабараторыях хімічнага факультэта. Трэцякурсніца Таццяна Лапкоўская выдатна выконвае практычнае заданне.

Фота С. Лыскаўца.

# ГІСТОРЫЯ НОВАЯ І НАВЕЙШАЯ

**Кафедра новай і навейшай гісторыі — адна са старэйшых на гістфаку. У мінулым годзе яна адзначала сваё саракагоддзе. І заўсёды сярод многіх аспектаў яе дзейнасці кіраўніцтва навукова-даследчай работай студэнтаў складала і складае адну з вядучых задач.**

**Пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры працуюць тры навуковыя студэнцкія гурткі: «Міжнародныя адносіны» (кіраўнікі дацэнты Д. С. Клімоўскі, В. І. Сініца), «Праблемы сучаснага камуністычнага, рабочага і нацыянальна-вызваленчага руху» (кіраўнікі дацэнт В. С. Кошалеў і кандыдат гістарычных навук П. А. Шупляк), «Гісторыя сацыялістычнага будаўніцтва ў ПНР» (кіраўнік дацэнт П. В. Лойка). Пасяджэнні гурткоў праводзяцца штомесяц. Студэнты выступаюць з паведамленнямі аб сваёй рабоце і з навуковымі дакладамі.**

**Вялікую работу па кіраўніцтву студэнцкай навукова-даследчай работай праводзяць загадчык кафедры прафесар Л. М. Шнеерсон і прафесар П. М. Трухноў. Паспяхова працуюць студэнты і пад кіраўніцтвам маладых выкладчыкаў кафедры Е. І. Новікавай, В. І. Сініцы, Л. В. Лойкі, П. А. Шупляка, О. Г. Радзьковай і інш.**

**На мінулагодні рэспубліканскі конкурс кафедра прадставіла 8 навуковых работ гуртоўцаў. Тры з іх ўдастоены І катэгорыі. Гэта работы: Н. Швед «Студэнцкі рух у Англіі (1970—1977)» (навуковы кіраўнік прафесар Л. М. Шнеерсон), Н. Гарбачова «Барацьба польскага рабочага класа за далейшае развіццё прамысловасці ў гады 4-й пяцігодкі (1971—1975 г.)» (навуковы кіраўнік дацэнт Л. В. Лойка), С. Карасюк «Умацаванне міжнародных пазіцый ГДР у 1970—1976 гг.)» (навуковы кіраўнік П. А. Шупляк). Работы Н. Казнова, А. Ладуцькі, В. Дубік удастоены ІІ катэгорыі. У лютым гэтага года шэсць студэнцкіх навуковых работ прадстаўлена на рэспубліканскі конкурс студэнцкіх навуковых работ па грамадскіх дысцыплінах.**

**Студэнты прынялі ўдзел у XXXV красавіцкай навуковай студэнцкай канферэнцыі, прысвечанай 108-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.**

**І. СЛІЖЭЎСКАЯ,**
студэнтка IV курса гістарычнага факультэта, староста гуртка.

## Фотарэпартаж з канферэнцыі

У гэтыя святочныя ленінскія дні ажыўлены і прыўзняты настрой пануе ў прасторных аўдыторыях нашага універсітэта. Пачала сваю работу чарговая XXXV навукова-практычная канферэнцыя студэнтаў БДУ, прысвечаная 108-й гадавіне з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. З кожным годам паляпшаецца якасць навуковай работы студэнтаў, расшыраецца яе тэматыка. Аб гэтым яскрава сведчаць даклады, якія былі прачытаны на пленарных і секцыйных пасяджэннях на розных факультэтах.

Актыўны ўдзел у правядзенні канферэнцыі прыняў і факультэт журналістыкі. На пленарнае і секцыйныя пасяджэнні было прадстаўлена 73 даклады ад усіх кафедр факультэта. Канферэнцыя падвяла вынікі навуковай дзейнасці студэнтаў за год.



# Залог эфектыўнасці

У плане работы «КП» факультэта журналістыкі вялікае месца адведзена вучобе «пражэктарыстаў». Гэта дзейсная форма павышэння актыўнасці студэнтаў.

Як зрабіць выпускі «КП» больш эфектыўнымі? Гэта тэма больш за ўсё цікавіць сёння стваральнікаў баявога камсамольскага органа друку.

Вучобу «пражэктарыстаў» на факультэце праводзіць старшыня «КП» журфака А. Зельдзін. Адбыліся 4 тэматычныя пасяджэнні. Апошняе было прысвечана барацьбе за паляпшэнне наведвання студэнтамі заняткаў. Члены «Камсамольскага пражэктара» распрацавалі цэлы шэраг мерапрыемстваў: тыдзень праверак і кантролю, спецыяльныя выпускі нумароў «КП», індывідуальныя гутаркі з асобнымі студэнтамі.

Пасля таго, як гэтыя мерапрыемствы былі праведзены, камітэтам камсамола і групай народнага кантролю было адзначана, што наведванне студэнтамі заняткаў значна палепшылася. Вынікі «тыдня наведвання» будуць змешчаны ў чарговым нумары «КП».

Так вучоба «пражэктарыстаў» дапамагае больш эфектыўна арганізоўваць работу «КП» на факультэце.

**Л. АСТАПОВІЧ,**
**член штаба «КП» БДУ**

# У штабе «КП» БДУ

Адбылося чарговае пасяджэнне штаба «КП» БДУ, на якім прысутнічалі члены штаба, старшыні «КП» факультэтаў. На сходзе выступіла старшыня штаба «КП» БДУ Г. І. Ільяшчук. Яна падвяла вынікі работы факультэцкіх «КП» за апошнія два месяцы. Адзначыла добрую работу «пражэктарыстаў» журфака, гістфака, факультэта радыёфізікі і электронікі.

Многа добрых пачынанняў у членаў «КП» гістарычнага факультэта. Яны праводзяць тыдні праверак наведвання студэнтамі заняткаў, рэйды-праверкі інтэрната № 1, работы буфета і бібліятэкі ў інтэрнаце. Да гэтай работы таксама прыцягнуты камітэт камсамола, прафбюро, студсавет факультэта. Зараз члены «КП» прыступілі да праверкі сталовых.

Выступаючая таксама адзначыла, што на некаторых факультэтах выходзяць шаблонныя нумары «КП». У прыватнасці, з гэтым недахопам трэба змагацца «пражэктарыстам» хімічнага і біялагічнага факультэтаў. Дарэчы, прадстаўнікі гэтых факультэтаў нават не прысутнічалі на пасяджэнні.

На сходзе таксама былі дадзены парады і рэкамендацыі старшыням факультэцкіх «КП» па паляпшэнню эфектыўнасці іх выступленняў.

**Т. ВЯЛІЦКАЯ,**
**член штаба «КП» БДУ.**

# У ПРАФБЮРО ЮРФАКА

З Аляксандрам Чыкілёвым — старшынёй прафбюро юрыдычнага факультэта мы пазнаёміліся зусім нядаўна. Цікавы, але ўжо надта сціплы субяседнік. Аб сабе амаль нічога не гаворыць, а больш — пра сяброў і старэйшых таварышаў — выкладчыкаў, пра мерапрыемствы, якія праводзіць прафбюро факультэта.

Саша расказаў аб вечары, які прысвячаўся Дню Савецкай Арміі. Прайшоў ён на самым высокім узроўні. Па просьбе студэнтаў на сустрэчу прыйшлі ўдзельнікі вайны, а зараз выкладчыкі кафедры крымінальнага працэсу і крымінальных спраў. Зараз студэнты-юрфакаўцы рыхтуюць вечар, прысвечаны 150-годдзю з дня нараджэння Л. М. Талстога. Ён будзе праведзен сумесна з бібліятэкай універсітэта.

Добрымі памочнікамі прафбюро ў падрыхтоўцы вечароў з'яўляецца вакальна - інструментальны ансамбль факультэта, якім кіруе студэнт I курса Карлен Мкртчан. Ансамбль быў створан зусім нядаўна, але ўжо карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод студэнтаў.

У саставе прафбюро юрыдычнага факультэта працуюць наступныя камісіі: спартыўна-аздараўленчая, вучэбна-вытворчая, культурна-масавая, жыллёва-бытавая. Непасрэдным абавязкам спартыўна - аздараўленчай камісіі з'яўляецца ўлік дыспансерных хворых, размеркаванне пуцёвак паміж студэнтамі.

Аляксандр Дзядок, напрыклад, правёў свае канікулы на адной з турбаз у Карпатах. Цудоўна адпачыў хлопец!

А вось Уладзімір Скрыпнік і Уладзімір Колатаў пабывалі ў доме адпачынку «Нарач».

Вучэбна-вытворчая камісія праводзіць цяпер тыдзень кантролю за наведваннем і паспяховасцю.

Нядаўна на факультэце адбыўся партыйны сход, які разгледзеў работу прафбюро, адзначыў яе моцныя і слабыя бакі. Была прынята пастанова аб паляпшэнні спартыўнай работы. Гэта рашэнне прынята да ўвагі членамі прафбюро.

Вялікую дапамогу студэнтам юрфака ў правядзенні розных мерапрыемстваў аказваюць сакратар партбюро В. Г. Ціхіня і яго намеснік М. А. Гарбар.

Т. ЛАЗОЎСКАЯ,
Я. ЗАХАР.
(Прэс-цэнтр прафкома БДУ).





**На здымках:**
**1. На пленарным пасяджэнні з дакладам «Слова ў кантэксце мастацкага цэлага» (слова ў жыцці і слова ў паэзіі) выступіла студэнтка III курса Л. Жогаль (навуковы кіраўнік прафесар М. Я. Цікоцкі).**
**2. У зале.**
**3. Зацікавіла тэма.**
Фота В. Драчова.

Нашы выдатнікі



# БЕЗ СКІДКІ НА ЎЗРОСТ

Адзін з вялікай групы выдатнікаў нашага універсітэта зацікавіў мяне асабліва. Чаму? Мяркуйце самі: Андрэй Рапінчук, студэнт механіка-матэматычнага факультэта займаецца зараз на III курсе. А яму ўсяго толькі 17 гадоў.

Андрэй — чалавек выдатны: разумны, вясёлы, сціплы, —так ахарактарызаваў яго сакратар камітэта камсамола мехмата Аляксандр Казулін. Але пазнаёмімся бліжэй з самім Андрэем.

— АНДРЭЙ, КОЛЬКІ Ж ГАДОЎ ТАБЕ БЫЛО, КАЛІ ТЫ ПАСТУПІЎ ВА УНІВЕРСІТЭТ?

— Чатырнаццаць. З заканчэннем сярэдняй школы вялікай праблемы не было: здаў экзамены экстэрнам.

— ЦІ ДАЎНО ТЫ ЗАЦІКАВІЎСЯ МАТЭМАТЫКАЙ?

— Па-мойму, няма сэнсу канкрэтна называць час. З матэматыкай я сябраваў заўсёды. З цягам часу наша дружба становіцца ўсё больш сталай і сур'ёзнай.

— І ЯКІЯ Ж ВЫНІКІ ТВАІХ СУР'ЁЗНЫХ АДНОСІН ДА МАТЭМАТЫКІ?

— Першы поспех прыйшоў нядаўна. Я стаў пераможцам Усесаюзнай алімпіяды па матэматыцы «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс», якая праходзіла ў 1976—77 гг. Прычына такога поспеху? Мне здаецца, што на гэта пытанне добра адказаў вядомы матэматык Гільберт: прычына ўсякага поспеху — у пастаянных разважаннях.

— МАТЭМАТЫКА — НАВУКА РОЗНАГАЛІНОВАЯ. ЯКІЯ ПРАБЛЕМЫ ЦЯБЕ БОЛЬШ ЗА ЎСЁ ЦІКАВЯЦЬ, НАД ЧЫМ ТЫ ПРАЦУЕШ?

— Займаюся тэорыяй алгебраічных груп. Зараз рыхтую навуковую працу, якую думаю прадставіць на канферэнцыі СНТ. Мая праца сінтэзуе ў сабе тры галіны ведаў: алгебру, філасофію і замежную мову.

— А ЯК У ЦЯБЕ ІДУЦЬ СПРАВЫ З АСТАТНІМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ?

— Усё ў парадку. Вучуся на выдатна. Але з-за захаплення матэматыкай на астатняе застаецца мала часу. Таму сесіі ў мяне вельмі напружаныя.

Вольны час? Яго не надта многа, але хапае для таго, каб схадзіць у кіно, у тэатр, паслухаць добрую музыку. Ну а спартыўны рэкардсмен з мяне не атрымаўся, мабыць, таму, што я займаюся адразу некалькімі відамі спорту, а не адным.

— ЯК АДНОСЯЦЦА ДА ЦЯБЕ ТВАЕ ТАВАРЫШЫ? УСЁ Ж ТАКІ ТВОЙ УЗРОСТ...

— Ды што там узрост! Мала хто пра яго і ведае. А група ў нас падабралася моцная. Усе сябруем. Першае месца на факультэце па паспяховасці займаем.

— АНДРЭЙ, ЯК ТЫ ЎЯЎЛЯЕШ СВАЮ БУДУЧЫНЮ?

— Пакуль што, прызнаюся, не зусім ясна. Але я цвёрда ўпэўнен, што яна абавязкова будзе звязана з матэматыкай.

Л. БРЫЖЭВІЧ,
студэнтка II курса журфака, член савета выдатнікаў пры камітэце камсамола БДУ.

# ГАРЫЗОНТЫ СЯБРОЎСТВА

...На камсамольскім сходзе, калі мы абмяркоўвалі план работы групы, наш стараста У. Бельскі прапанаваў арганізаваць сустрэчу са студэнтамі пятага курса геафака.

— Чаму з географамі?

— Журналісты і географы? Да ты што?

— Аб чым з імі гаварыць? Што ў нас з імі агульнага? — сыпаліся градам пытанні.

Сапраўды, чаму сустрэча з географамі? Звычайна запрашаюць ветэранаў вайны і працы, паэтаў і пісьменнікаў, артыстаў і лектараў, а тут — географы. Тым больш — студэнты!

Аргументы прымусілі задумацца. Група геаграфаў - эканамістаў — адна з лепшых акадэмічных груп ва універсітэце. За гэтымі словамі стаяць пяць гадоў вучобы і грамаднага жыцця. Да лаўраў пераможцаў студэнты ішлі цэлых пяць гадоў. Хіба не цікавым будзе іх вопыт для нас?

Арганізацыю вечара пачалі з таго, што звярнуліся за дапамогай у прафбюро факультэта. Прыемна, што мы адразу атрымалі згоду і падтрымку. Загадзя быў напісан сцэнарый. «Агеньчык» вырашылі правесці ў аўдыторыі, якая тэхнічна абсталявана сучаснымі радыётэлевізійнымі прыладамі і якія можна было скарыстаць у ходзе вечара. Уявіце цяпер сябе ў наступных абставінах. Пры ўваходзе адзін вядучы прышпільвае вам значок як памяць аб сустрэчы. Вы заходзіце ў прыгожа прыбраную залу. Другі вядучы праводзіць вас да столікаў. Гучыць музыка. Тэлевізійная камера без дапамогі апаратара здымае вас, і на экране тэлевізара вы бачыце сябе. А калі — упершыню?! Цікава!

Знаёмства пачынаецца з радыёперадачы. Яе рыхтавала амаль уся група. Па водгуках прысутнічаючых, цікавая старонка ў перадачы — тая, дзе мы расказалі гасцям аб сабе. Мы пісалі адзін пра аднаго.

У сваю чаргу географы расказваюць аб сабе. Як яны сталі пераможцамі ў сацыялістычным спаборніцтве. Па словах іх куратара Л. А. Паўловіч, толькі праца і яшчэ раз праца, дысцыпліна, узаемаразуменне куратара і студэнтаў ва ўсіх справах далі станоўчыя вынікі.

Знаёмства працягваецца. Пяцікурснікі дзеляцца вопытам. Адказваюць на пытанні сваіх новых знаёмых, новых сяброў. Аказваецца, што вельмі рамантычная прафесія і ў географаў. Паездкі і экспедыцыі па нашай краіне і за мяжу. Знаёмствы з калегамі з іншых універсітэтаў. Вывучэнне гісторыі роднай Беларусі. Каго не зацікавяць расказы пра ўсё гэта! Расказваем пра сябе і мы.

У канцы вечара студэнты арганізавалі сумеснымі сіламі маленькі канцэрт мастацкай самадзейнасці. Выступленні былі зладжаныя і цікавыя. Проста не верылася, што разам спяваюць, чытаюць вершы, ставяць гумарыстычныя сцэнкі людзі, знаёмыя ўсяго толькі дзве гадзіны.

У заключэнне хочацца сказаць, што гэта быў першы, так сказаць, эксперыментальны вечар. Уражанні аб ім цяжка перадаць на паперы. На жаль, часта так бывае: студэнты ведаюць, што існуе той ці іншы факультэт, а як і чым жывуць яго студэнты, не ўяўляюць. Мы паспрабавалі адшукаць новую форму арганізацыі культмасавай работы, якая адначасова дапамагае знаёміцца з жыццём студэнтаў розных факультэтаў, расшырае гарызонты студэнцкай дружбы.

У. ДЗЯТЧЫК,
студэнт II курса журфака.

## Сатырык — госць студэнтаў

Нядаўна грамадскасць нашай рэспублікі адзначыла 60-гадовы юбілей вядомага беларускага паэта-байкапісца Эдуарда Валасевіча.

...І вось самая вялікая аўдыторыя філфака БДУ перапоўнена. Перад сваімі шматлікімі чытачамі прадстаў сам юбіляр.

Уступнае слова пра жыццё і творчы шлях Э. С. Валасевіча сказаў паэт Казімір Камейша. Ён падзяліўся думкамі аб сучаснай паэзіі, аб цяжкасцях «сатырычнага цэха».

Народны артыст БССР Генадзь Аўсянікаў пазнаёміў слухачоў з байкамі і вершамі паэта-сатырыка.

Некалькі слоў аб сабе сказаў Эдуард Станіслававіч. Ён прачытаў свае вершы, пародыі, пераклады, падзяліўся задумамі.

Ад імя студэнтаў Д. Цвірко павіншавала юбіляра, падзякавала яму за цёплую сустрэчу і пажадала новых творчых поспехаў.

У. МАЗГО,
студэнт II курса
філфака
аддзялення беларускай
мовы і літаратуры.

## На студэнцкай сцэне

Адбылася прэм'ера п'есы А. Арбузава «Шасцёра каханых» у народным тэатры БДУ. Галоўную ролю ў п'есе вельмі эмацыянальна і на высокім мастацкім узроўні выканала супрацоўніца вылічальнага цэнтра БДУ Таццяна Каралюк. У спектаклі ўдзельнічалі студэнты Л. Левашвілі (філфак), Н. Хіневіч (мехмат), В. Каліноўскі (юрфак), А. Марозаў (журфак), К. Кірэенка (біяфак). Рэжысёр — заслужаны артыст Латвійскай ССР А. М. Озераў.

Т. АЛЯКСАНДРАВА.

## У ВНУ краіны

### ДЛЯ ПАВЫШЭННЯ ЯКАСЦІ НАВУЧАННЯ

Сачыць за ходам хімічных рэакцый і фізічных працэсаў студэнты Хабараўскага інстытута чыгуначнага транспарту могуць, не выходзячы з лекцыйных аўдыторый. У гэтым ім дапамагае тэлеінфармацыйная сістэма «Экспрэс», змантыраваная самімі студэнтамі. Яны ж — дыктары, тэхнікі, аператары. У калідорах, холах і аўдыторыях на блакітных экранах, акрамя вучэбнай, трансліруюцца яшчэ дзве праграмы — цэнтральнага тэлебачання і інстытуцкія інфармацыйныя выпускі.

Сучасныя тэхнічныя сродкі ў ВНУ усё шырэй укараняюцца ў вучэбны працэс. Традыцыйны мялок і чорная дошка змяніліся відэамагнітафонам і электроннай указкай. У зале электронна-вылічальных машын традыцыйныя лекцыі замяніў шматсерыйны відэафільм, зняты калектывам кафедры вылічальнай тэхнікі.

### ЦУДОЎНЫ ПАЧЫН

З цудоўным пачынам выступілі камсамольцы Адэскага інжынерна-будаўнічага інстытута, якія прынялі рашэнне збудаваць на чарнаморскім востраве Беразань помнік легендарнаму герою першай рускай рэвалюцыі лейтэнанту П. П. Шміту і яго паплечнікам-маракам. У студэнцкі будаўнічы атрад запісалася на 27 месц 200 добраахвотнікаў. Ім давялося працаваць у цяжкіх умовах: на бязлюдным скалістым востраве з-за штормаў бывалі перабоі з вадой і харчам, увесь груз даводзілася пераносіць на плячах. Хутка на востраве ўзняўся ўвысь 16-метровы манумент у форме трох ветразяў. Цяпер караблі, якія праплываюць каля вострава, салютуюць памяці П. П. Шміта і яго таварышаў па барацьбе, аддаўшых сваё жыццё за шчасце народа.

# СПОРТ

## За званне мацнейшага



Два дні на барцоўскім дыване праходзілі ўпартыя схваткі першынства самбістаў нашага універсітэта. Званне мацнейшых аспрэчвалі 123 спартсмены ў 10 вагавых катэгорыях. Чэмпіёнамі універсітэта сталі ў вагавой катэгорыі да 48 кг—А. Русаковіч, студэнт журфака, 52 кг — А. Дзяхцяр, студэнт мехмата, 62 кг—Я. Ляльчук, студэнт ФПМ, 74 кг—В. Кулікоў, студэнт юрфака.

Асабліва вылучыўся першакурснік з мехмата А. Юркевіч, які правёў усе схваткі без паражэння і стаў пераможцай у вагавой катэгорыі да 90 кг. У камандным заліку першае месца ў зборнай юрфака — 290 ачкоў. На другім месцы самбісты радыёфізічнага факультэта — 106 ачкоў. Усяго толькі два ачкі ўступілі ім спартсмены фізічнага факультэта і тым самым забяспечылі сабе трэцяе месца.

Пасля спаборніцтваў ва ўрачыстай абстаноўцы адбылося ўзнагароджанне пераможцаў.

М. ХАЛІМОНЧЫК.

●

**На здымку:** у час спаборніцтваў.

Фота **А. Веруша.**

## На блакітных дарожках

У Палацы воднага спорту праходзілі спаборніцтвы па плаванню на першынство БДУ імя У. І. Леніна. У іх прымалі ўдзел каманды дзесяці факультэтаў. Спаборніцтвы адкрыліся урачыстым парадам. Да ўдзельнікаў спаборніцтваў з прывітальным словам звярнуўся старшыня аргкамітэта па правядзенню агульнауніверсітэцкай спартакіяды, старшыня спортклуба В. П. Шапялевіч.

У першы дзень спаборніцтваў у заплыве на 100 метраў вольным стылем сярод дзяўчат першае месца заняла студэнтка механіка-матэматычнага факультэта, кандыдат у майстры спорту Таццяна Кулеш. У юнакоў на гэтай дыстанцыі званне чэмпіёна БДУ заваяваў студэнт IV курса механіка-матэматычнага факультэта, кандыдат у майстры спорту Сяргей Максімаў. Ён фінішаваў з вынікам 1.00,8 мін.

На стометроўцы стылем батэрфляй выйшла на 1-е месца і стала чэмпіёнкай БДУ прадстаўніца каманды гістфака Святлана Зубарава. Упартая барацьба разгарнулася на гэтай дыстанцыі сярод юнакоў, дзе званне чэмпіёна аспрэчвалі член зборнай каманды Беларусі, майстар спорту Сяргей Грышаль і кандыдат у майстры спорту Сяргей Максімаў — прадстаўнікі каманды механіка-матэматычнага факультэта. У выніку Сяргей Грышаль з вынікам 1.02,2 мін. устанавіў новы рэкорд БДУ. Усяго на чатыры дзесятыя адстаў ад яго Максімаў.

Цікава прайшлі заплывы ў эстафеце сярод юнацкіх каманд. Калі званне чэмпіёна трывала замацавалася за камандай мехмата, то за другое і трэцяе месцы разгарнулася барацьба паміж прадстаўнікамі фізфака і геафака. 2-е месца дасталася камандзе фізічнага факультэта, якая абышла сапернікаў на 1 секунду.

На другі дзень лепшыя плыўцы мераліся сіламі на дыстанцыях па 100 метраў брасам, на спіне ў камбінаванай эстафеце 4×100 метраў.

Узяўшы добры тэмп у пачатку спаборніцтваў, каманда механіка-матэматычнага факультэта працягвала пераможнае шэсце і абышла сапернікаў на ўсіх дыстанцыях, акрамя стометроўкі на спіне, дзе 1-е месца заваявала студэнтка ФПМ Вольга Салаўёва.

У агульным камандным заліку каманда мехмата набрала 279,5 ачка. Другое месца заняла каманда фізічнага факультэта з вынікам 205,5 ачка і на трэцім — каманда гістфака — 158 ачкоў. Астатнія месцы размеркаваліся так: радыёфізічны факультэт, юрфак, геафак, біяфак, журфак, ФПМ і на апошнім, 10-м месцы — каманда хімічнага факультэта.

Т. КАЛЕНЧЫЦ,
студэнтка журфака.

## Па алеях парку

По традыцыі месцам правядзення фіналу агульнауніверсітэцкага кросу выбіраецца парк Перамогі. У фінале вясенняга кросу, які ўваходзіць у праграму XXV круглагадавой спартакіяды БДУ імя У. І. Леніна, спаборнічала каля 1500 студэнтаў, якія прадстаўлялі каманды адзінаццаці факультэтаў.

У цёплы сонечны дзень на працягу амаль чатырох гадзін на алеях парка праходзіла вострая барацьба на дыстанцыях кросу. У адным з першых забегаў мужчын на дыстанцыі 1000 метраў лепшы вынік — 2.29,0 мін. паказаў студэнт IV курса фізічнага факультэта Уладзімір Квач. Ён яшчэ раз пацвердзіў званне мацнейшага бегуна універсітэта. Усяго адну секунду прайграў чэмпіёну яго таварыш па камандзе Аляксандр Кекала. Лічаныя долі секунды раздзялілі трэцяга прызёра А. Жыльскага (гістфак) і М. Касяка (журфак), заняўшага чацвёртае месца.

Сярод жанчын на дыстанцыі 500 метраў першай на фінішы была Зоя Зусько (філфак) з вынікам 1.19,0 мін. На другім і трэцім месцах прадстаўніцы каманды ФПМ Э. Акалова і Л. Кандрашова, адпаведна 1.23,0 і 1.24,4 мін. У агульнакамандным заліку месцы размеркаваліся наступным чынам: гістфак, факультэт радыёфізікі і электронікі, ФПМ. Прыемна адзначыць, што ў ходзе гэтых масавых спаборніцтваў, прайшоўшых на высокім арганізацыйным узроўні і ў цікавай барацьбе, звыш 200 удзельнікаў выканалі нарматывы спартыўных разрадаў.

У. ШЫК.





●

**На здымках:**

пераможца агульнауніверсітэцкага кросу на дыстанцыі 1000 метраў студэнт IV курса фізічнага факультэта Уладзімір Квач;

на дыстанцыі — удзельнікі аднаго з забегаў кросу.

Фота **В. МАСКАЛЁВА.**

●

## АБ'ЯВА

**22—23 красавіка праводзіцца першынство па тэхніцы пешаходнага турызму.**

**У праграму злёту-спаборніцтваў уваходзіць арыентаванне на мясцовасці па 12-кіламетровай трасе, індывідуальнае прааадоленне паласы перашкод, конкурс турысцкай песні, каманднае праадоленне паласы перашкод, конкурс на лепшае афармленне палаткі, конкурс повараў.**

**Першынство праводзіцца з мэтай прапаганды турызму сярод студэнтаў універсітэта і для праверкі гатоўнасці турысцкай групы, выходзячай у зорныя паходы ў перыяд майскіх свят.**

**СПОРТКЛУБ І ТУРКЛУБ БДУ.**

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 03198 Тыраж 2000 экз. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Зак. № 655.